ISSN 2351-6658
ISSN (ONLINE) 2351-6666

# СЯДЗІБНЫ КОМПЛЕКС РЭЙТАНАЎ: ТУРЫСТЫЧНЫ ПАТЭНЦЫЯЛ ЗАКАНСЕРВАВАНЫХ ПОМНІКАЎ АРХІТЭКТУРЫ

**ПАВЕЛ БУЛАТЫ**

***Анатацыя:*** Рэспубліка Беларусь валодае пэўнымі рэсурсамі для развіцця турызму. Гісторыка-культурная спадчына ўключае больш за 15 тысяч аб'ектаў, якія маюць гістарычную значнасць і дазваляюць развіваць культурна-пазнавальны турызм. У сілу свайго геапалітычнага становішча тэрыторыя Беларусі часта станавілася арэнай ваенных дзеянняў і гістарычных катаклізмаў, што абумовіла адносна невысокую ступень захаванасці архітэктурных помнікаў. Адным з метадаў захавання спадчыны з'яўляецца выкарыстанне яе ў турыстычных мэтах.

***Ключавыя словы:*** культурна-гістарычная спадчына, турызм, сядзіба Рэйтанаў.

# THE REITANS' HOMESTEAD COMPLEX: TOURISM POTENTIAL OF CONSERVED ARCHITECTURAL MONUMENTS

***Abstract:*** The Republic of Belarus has certain potential for the development of tourism. Over 15 thousand of places with historical value are part of our heritage which helps to develop cultural tourism. Owing to its geopolitical location, the territory of Belarus has often been an arena for hostilities and historical cataclysms. Therefore, the preservation level of the architectural monuments isn't high, some of them are abandoned or even destroyed. The article considers the possibilities of usage of unrestored heritage assets for tourism purposes.

***Keywords:*** Cultural and Historical Heritage, Tourism, Reitans' Homestead.

Аптымальным метадам захавання і аднаўлення помнікаў архітэктуры з'яўляецца рэстаўрацыя, якая вызначаецца як комплекс мерапрыемстваў па навукова абгрунтаваным аднаўленні страчаных фрагментаў матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцяў, а таксама іх адметных духоўных, мастацкіх і (або) дакументальных вартасцей, якія абумовілі наданне ім статуса гісторыка-культурнай каштоўнасці (Закон РБ, 2006).

Пры значных разбурэннях або страце помніка ўжываюць рэканструкцыю, галоўнае патрабаванне да якой – навукова абгрунтаваны падыход да аднаўлення аб'екта. Галоўная задача рэканструкцыі – максімальна поўнае і дакладнае аднаўленне першапачатковага аблічча аб'екта. Ажыццяўленне працэсу рэканструкцыі займае працяглы прамежак часу і патрабуе немалых фінансавых выдаткаў, спецыялістаў высокага ўзроўню, бездакорнай якасці выкананых работ.

Менавіта якасць прац па рэканструкцыі ў апошні час выклікае вялікую колькасць нараканняў. На думку доктара архітэктуры А. Сардарава (2012), у дзеяннях беларускіх рэстаўратараў *"часам няма здаровага сэнсу, нярэдка забываюцца такія паняцці, як прыгажосць, эстэтыка і гістарычнасць".* У ліку прыкладаў няякасных аднаўленчых работ можна вылучыць касцёл Святых Сымона і Алены, дзе вылучаецца дах-навароб на фоне аўтэнтычнай дахоўкі; гатычны храм у вёсцы Ішкальдзь з металічнай дахоўкай, шклопакеты ў Нясвіжскім і Мірскім замках. Адзначаюцца таксама элементы вельмі няякаснай рэстаўрацыі замка ў Лідзе.

Асобныя нюансы ў хібах зробленых работ могуць быць бачны толькі адмыслоўцу або дасведчанаму ў архітэктуры чалавеку. Больш сур'ёзныя праблемы ўзнікаюць у сферы аднаўлення помнікаў, калі з прычыны нізкай якасці рэстаўрацыі і рэканструкцыі губляецца культурны асяродак, які нясе ў сабе адбітак мінулага, атмасферу даўніны, а эстэтычная каштоўнасць старой архітэктуры ліквідуецца з улікам сучасных патрабаванняў да эксплуатацыі.

Захаваць аўтэнтычны стан гісторыка-архітэктурных помнікаў як каштоўнай часткі спадчыны магчыма пры кансервацыі, якая ўяўляе сабой комплекс мерапрыемстваў па часовым або доўгатэрміновым забеспячэнні захаванасці каштоўнасцяў, з прымяненнем адпаведных метадаў, якія дазваляюць прадухіліць іх далейшае пагаршэнне і ствараюць умовы для экспанавання закансерваваных матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцяў (Закон РБ, 2006). Галоўная задача дадзенага метаду – стабілізацыя стану і доўгачасовае захаванне помніка.

Сёння для Беларусі метад кансервацыі з'яўляецца аптымальным для шэрага помнікаў:

- па-першае, з прычыны меншых фінансавых выдаткаў;

- па-другое, з прычыны наяўнасці вялікай колькасці аб'ектаў, якія маюць патрэбу ў аднаўленні;

- па-трэцяе, захоўваецца аўтэнтычнасць старадаўняй архітэктуры ў належным эстэтычным стане, які дазваляе выкарыстоўваць аб'екты як экскурсійны рэсурс.

Аднаўленне помнікаў заклікана не толькі захаваць гісторыка-культурны здабытак, але і забяспечыць яго далейшае выкарыстанне ў турыстычным абароце, паколькі турызм спрыяе папулярызацыі аб'ектаў спадчыны.

Магчымасць практычнага выкарыстання нерэстаўраваных помнікаў гісторыі і архітэктуры ў турыстычных мэтах прадстаўлена на прыкладзе сядзібы Рэйтанаў, размешчанай у вёсцы Грушаўка Ляхавіцкага раёна Брэсцкай вобласці.

Вёска Грушаўка, дзе знаходзіцца сядзіба знакамітага шляхецкага роду Рэйтанаў, мае непаўторную і ўнікальную гісторыю. У XVII – сярэдзіне XX стагоддзя Грушаўка з'яўлялася рэзідэнцыяй роду, слаўныя старонкі якога ўпісаны ў гісторыю Рэчы Паспалітай. Прадстаўніка роду Тадэвуша Рэйтана, вядомага як непрымірымага і цвёрдага праціўніка падзелаў Рэчы Паспалітай, шануюць як патрыёта сваёй айчыны далёка за яе межамі. На мяжы XIX–XX стагоддзяў у Грушаўцы апошнія прадстаўнікі роду – Юзэф і Аліна Рэйтан – заклалі сядзібна-паркавы комплекс, які захаваўся да нашых дзён (Федарук, 2006: 424–429).

У гістарычным аспекце сядзіба валодае патэнцыялам для цікавага экскурсійнага аповеду і значнымі магчымасцямі для паказу. У цяперашні час на тэрыторыі сядзібы прадстаўлены (Федарук, 2006):

- Сядзібны дом у стылі мадэрн, пабудаваны на пачатку XX стагоддзя на падмурках дома XVII стагоддзя (ад яго захаваўся склеп). Захаваліся элементы інтэр'ера: паркет, рэшткі камінаў, шпалеры, ляпная столь.
- Фамільная капліца, пабудаваная на пачатку XX стагоддзя ў выглядзе мініяцюрнага гатычнага храма. У капліцы захаваліся магільныя пліты з імёнамі нябожчыкаў, а таксама алтар над магілай Ю. Рэйтана.
- Два флігелі: адзін флігель "мураванка", узведзены ў XVII стагоддзі, дзе захоўваўся фамільны архіў роду, другі – гаспадарчы, пабудаваны ў XX стагоддзі.
- Напаўразбураная лядоўня і аранжарэя.
- Стайні, выбудаваныя ў стылі псеўдаготыкі.
- Свіран.
- Руіны бровара.
- Парк рэгулярнай planіроўкі і пладовы сад.

Праведзены аналіз дадзеных аб'ектаў у якасці экскурсійных заснаваны на вывучэнні візуальнай выразнасці, захаванасці будынкаў,

аўтэнтычнасці і кампазіцыйнай цэласнасці ўсяго комплексу, а таксама на вызначэнні ступені бяспекі для турыстаў, адлюстроўвае відавочна высокую ступень захаванасці сядзібы як комплексу, што дазваляе разглядаць яе як цікавы экскурсійны рэсурс. Для паўнавартаснага выкарыстання ў экскурсійна-турыстычных маршрутах сядзібны комплекс на сённяшні дзень мае патрэбу ў пэўных мерах па захаванні і падтрымцы.

Сёння сядзіба Рэйтанаў у Грушаўцы, па дадзеных турыстычнага інтэрнэт-партала globus.tut.by, з'яўляецца адным з самых папулярных месцаў наведвання ў рэгіёне. На жаль, пераважаюць неарганізаваныя групы турыстаў, якія штогод наведваюць сядзібу з вясны да восені.

Сучасны стан, ступень захаванасці і актыўны рост цікавасці турыстаў дазваляюць уводзіць дадзены аб'ект у экскурсійныя маршруты. На аснове вывучэння гістарычных матэрыялаў, экскурсійных магчымасцяў сядзібы і патэнцыйнага турыстычнага інтарэсу ў 2012 годзе быў распрацаваны і ўкаранёны сумесна з клубам беларускай асацыяцыі ЮНЕСКА экскурсійны маршрут па сядзібе "Забытая сядзіба, альбом гісторыі аднаго шляхецкага роду". Блізкасць да галоўных турыстычных цэнтраў Рэспублікі Беларусь – Міра і Нясвіжа – пры паспяховай рэалізацыі праекта дае магчымасць сфармаваць шырокае кола экскурсантаў, якія цікавяцца гісторыяй і арыгінальнасцю сядзібы, і ўключыць дадзены аб'ект у розныя турыстычныя і экскурсійныя маршруты. Росту турыстычнай прывабнасці сядзібы будуць спрыяць неабходныя меры: уладкаванне інфраструктуры, рэклама ў СМІ і меры па захаванні аб'екта. Перавагі кансервацыі для аб'екта заключаюцца ў наступным:

1. паказ аўтэнтычных аб'ектаў;
2. захаванне арыгінальных сапраўдных элементаў экстэр'ера і інтэр'ера;
3. візуальная выразнасць;
4. адсутнасць "культурных пластоў" іншых эпох;
5. умеранасць фінансавых выдаткаў і ўкладанняў;
6. патэнцыял для інтэрактыўных экскурсій і рэканструкцый, што можа стаць цікавым для шырокага кола турыстаў.

Кансервацыя і экспазіцыя помнікаў архітэктуры дазваляе захоўваць іх у натуральным эстэтычным стане як каштоўную частку спадчыны. На прыкладзе сядзібы Рэйтанаў відавочна, што аб'ект можна выкарыстоўваць у арганізацыі экскурсійных маршрутаў без маштабных рэстаўрацыйных і аднаўленчых работ. Дадзены варыянт увядзення ў экскурсійны абарот аб'ектаў культурна-гістарычнай спадчыны магчымы для многіх беларускіх помнікаў і спрыяльны для развіцця экскурсійнага турызму.

***Бібліяграфія***

1. Брянцева, Ольга (2012). «Жизнь в розовом цвете, или Реставрация по-голливудски..», *Республиканская строительная газета,* 20.01.2012. (URL (доступ 17.02.2015): http://bsc.by/story/zhizn-v-rozovom-cvete-ili-restavraciya-po-gollivudski/

2. *Закон Рэспублікі Беларусь "Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь"* (9 студзеня 2006 г. № 98-З), URL (доступ 17.02.2015): http://www.pravo.by/main.aspx?guid=3871&p0=h10600098&p2={NRPA}

3. Федорук, Анатолий (2006). *Старинные усадьбы Берестейщины.* Минск: Беларуская энцыклапедыя.